*Анучына Н. У.* DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-24-27

УДК [002.2+069.1](476.5-21Полацк)

# ІНСКРЫПТЫ Ў КНІЖНЫМ ЗБОРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛАЦКАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА: РЭПРЭЗЕНТАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І МАГЧЫМАСЦІ ЭКСПАНАВАННЯ

*Анучына Наталля Уладзіміраўна,*
*старшы навуковы супрацоўнік Музея беларускага кнігадрукавання — філіяла НПГКМЗ*

*У артыкуле разглядаецца пытанне рэпрэзентацыйнага патэнцыялу інскрыптаў на матэрыяле дароўных надпісаў з кніжнага збору Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, а таксама магчымасці выкарыстання выданняў з аўтографамі ў выставачнай дзейнасці Музея беларускага кнігадрукавання.*

***Ключавыя словы****: інскрыпты, дароўныя надпісы, рэпрэзентацыя, выстаўка, Музей беларускага кнігадрукавання.*

У верасні 2020 г. Музей беларускага кнігадрукавання адзначыў свой 30-гадовы юбілей, да якога была прымеркавана выстаўка «У самы жывы з усіх музеяў з пажаданнямі...» (выданні з дароўнымі надпісамі са збору НПГКМЗ). Мэта выстаўкі заключалася ў тым, каб прадставіць розныя аспекты дзейнасці Музея беларускага кнігадрукавання праз прызму адрасаванага яму дароўнага надпісу. У якасці назвы для выстаўкі былі ўзяты словы з дароўнага надпісу, які на сваёй кнізе «Азярод» (Мінск, 2003; КП18-21269) пакінуў Сяргей Рублеўскі*: «У самы // жывы з усіх // музеяў з пажаданнямі // і надзеяй быць // асветніцкім // цэнтрам роднай // Бацькаўшчыны. //* [Сяргей Рублеўскі] *// 19.02.2004»*.

У фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (НПГКМЗ) захоўваецца вялікая колькасць выданняў (на пачатак 2021 г. з калекцыі «Друкаваныя выданні» выяўлена каля тысячы адзінак) з дароўнымі надпісамі, амаль палова якіх — у адрас Музея беларускага кнігадрукавання. Такія пісьмовыя сведчанні выклікаюць безумоўную цікавасць для музейнай гісторыі, дабаўляюць раней не вядомыя факты да біяграфій дарыцеляў, адлюстроўваюць рэаліі часу, валодаюць здольнасцю ўзнаўляць факт, падзею, з'яву. Дзякуючы аўтографам кніга становіцца ўнікальнай, набывае асобую гісторыка-культурную значнасць, прачытваецца як каштоўная гістарычная крыніца.

Асноўнай формай духоўнага захавання музейных каштоўнасцей і вызначальнай формай існавання музея з'яўляецца яго экспазіцыя. Гэта аксіёма дазваляе разглядаць экспазіцыйна-выставачную дзейнасць музеяў як прыярытэтную, якая забяспечвае непасрэдны доступ наведвальнікаў да музейных каштоўнасцей. Выстаўка, як і пастаянная экспазіцыя, — гэта арганічна ўласцівая музею форма рэпрэзентацыі [1, с. 194].

Кнігам з аўтографамі ў выставачнай дзейнасці музея надаецца важнае значэнне, часта яны выступаюць у ролі своеасаблівых акцэнтаў. На выстаўцы «У самы жывы з усіх музеяў з пажаданнямі...» выданні з дароўнымі надпісамі склалі асноўны прадметны рад. Пры падрыхтоўцы важна было пазбегнуць перанасычанасці экспазіцыі і выбраць выданні з дароўнымі надпісамі, якія ў найбольшай ступені прадстаўляюць (рэпрэзентуюць) тэму асобнага раздзела і выстаўкі ў цэлым. Пры адборы дароўных надпісаў улічвалася наступнае: арыгінальны змест, літаратурная форма аўтографа, значнасць асобы дарыцеля, рэдкасць падараванай кнігі і яе асобыя характарыстыкі. Асаблівасць надпісаў, як і дакументальных матэрыялаў, у цяжкасці ўспрымання: іх змест можна ўспрыняць толькі шляхам прачытання — працэсу больш складанага і працяглага ў параўнанні са зрокавым успрыманнем. Таму немалаважным крытэрыем адбору была і экспазіцыйная выразнасць дароўнага надпісу: афармленне, разборлівасць тэксту, ступень захаванасці. Акрамя таго, інскрыпт знаходзіцца ў падначаленым стане ў адносінах да кнігі; з гэтай прычыны магчымасць яго экспанавання залежыць таксама і ад канкрэтнага выдання: ад месца знаходжання ў кнізе, захаванасці і памеру кнігі, спосабу мацавання кніжнага блока і інш. Адбор прадметаў праводзіўся таксама з улікам экспазіцыйнай плошчы (38 $м^2$).

Такім чынам, з фондаў НПГКМЗ было адабрана 48 прадметаў — кнігі, брашуры, часопісы, а таксама аўдыё-кнігі — з дароўнымі надпісамі ў адрас Музея беларускага кнігадрукавання, якія ахапілі перыяд з 1986 па 2019 г. У мэтах пашырэння прадметнага рада ў мастацкім рашэнні выстаўкі былі выкарыстаны факсімільныя выявы дароўных надпісаў, а таксама фотаздымкі, зробленыя падчас рэстаўрацыйных работ, афіцыйнага адкрыцця музея, прэзентацый, аўтограф-сесій і г. д., якія надалі выстаўцы дакументальнасць.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-24-27

Згодна з навуковай канцэпцыяй, выстаўка складалася з шасці тэматычных комплексаў.

*Тэматычны комплекс 1* прадстаўляў матэрыялы, звязаныя з падрыхтоўкай да адкрыцця Музея беларускага кнігадрукавання, кнігі з першых паступленняў з дароўнымі надпісамі музею.

Ідэя стварэння ў Беларусі музея, прысвечанага кнізе, непасрэдна звязана з імем Францыска Скарыны. У 1981 г. Урадам БССР і Акадэміяй навук была распрацавана праграма «Францыск Скарына — вялікі беларускі асветнік-гуманіст, выдатны дзеяч славянскай культуры». Ажыццяўленне праграмы і стварэнне музея было накіравана на падрыхтоўку да 500-гадовага юбілею з дня нараджэння Ф. Скарыны (1990 г.) [2]. Пад будучы музей быў выдзелены будынак былога Богаяўленскага манастыра XVIII ст. Рэстаўрацыйныя работы і камплектаванне калекцыі будучага музея пачаліся ў 1986 г. Аўтарам праекта рэстаўрацыі быў Віктар Калечыц, аўтарам навуковай канцэпцыі — Галіна Ладзісава. Ажыццяўлялі ідэю мастакі Сяргей Дзмітрыеў і Ігар Куржалаў. Навуковую падтрымку і дапамогу ў збіранні экспанатаў аказалі Мікалай Нікалаеў, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Чамярыцкі і іншыя навукоўцы, пісьменнікі, краязнаўцы. Перадаваліся кнігі з абменна-рэзервовых фондаў бібліятэк Масквы, Ленінграда, Смаленска, Мінска (Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна, Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя Леніна, Публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына і інш.).

Асноўныя матэрыялы комплексу: кнігі «Francisk Skorina» В. Чамярыцкага, Г. Галенчанкі, В. Шматава (UNESCO, 1979; КП16-17143) з дароўным надпісам Вячаслава Чамярыцкага: *«Дарагім землякам // вялікага беларускага асветніка // з надзеяй і вераю // ў канчатковую перамогу // хараша пачатага нашым // славутым папярэднікам // беларускага Адраджэння. Ад сэрца. В. Чамярыцкі. // 24/VIII.90 г. // Менск*»; «Фёдоровские чтения. 1978» (Масква, 1981; КП4-2030) з дароўнымі надпісамі ад Музея кнігі Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна і Юрыя Лабынцава: *«Музею белорусского // книгопечатания в г. Полоцке // в дар от Музея книги Государственной // библиотеки СССР им. В. И. Ленина // 7.II.86.*», «*С пожеланиями // разработать достойную // экспозицию по истории // книгопечатания. // 7.II.86 г.*»; «Браніслава» Сяргея Панізніка (Мінск, 1985; КП4-2188) з дароўным надпісам аўтара: «*Музею Беларускага // кнігадрукавання // ў Полацку // зямляк і аўтар // Сяргей Панізнік // 7.1.87 г.*» і інш. «*Музею — скарбніцы кніжнай у Полацку*» падпісаў для Музея кнігу Адам Мальдзіс («Адам Міцкевіч і Беларусь», Мінск, 1997; КП16-16707), чым не толькі падкрэсліў такія напрамкі дзейнасці музея, як збіранне і захоўванне, але і абазначыў яго статус, значэнне, каштоўнасць кніжнай калекцыі.

Матэрыялы *тэматычнага комплексу 2* былі звязаны з адкрыццём Музея беларускага кнігадрукавання і першымі гадамі яго працы.

8 верасня 1990 г. у Полацку адбылося ўрачыстае адкрыццё Музея беларускага кнігадрукавання. На свяце прысутнічаў нашчадак Францыска Скарыны — доктар медыцыны, прафесар Манрэальскага ўніверсітэта Стэнлі (Станіслаў Канстанцін) Скарына. Суправаджалі госця літаратуразнаўца Адам Мальдзіс і старшыня Дзяржаўнага камітэта па друку Анатоль Бутэвіч.

Аднымі з галоўных экспанатаў комплексу сталі фотаздымкі, зробленыя падчас урачыстасцей (КП19-23367, КП19-23369).

За 30 гадоў у сценах Музея беларускага кнігадрукавання было праведзена шмат цікавых сустрэч, прэзентацый, выставачных праектаў. Пасля кожнага такога мерапрыемства кніжны фонд музея-запаведніка папаўняецца новымі ўнікальнымі выданнямі, некаторыя з іх склалі асноўны прадметны рад *3* і *4 тэматычных комплексаў*: «*Музею Беларускага // кнігадрукаваньня // ў сьвятым горадзе // Полацку // В. Быкаў // 11.10.98. Менск*» (В. Быкаў «Сьцяна», Мінск, 1997; КП15-14165), «*Музею беларускага // кнігадрукавання ў Полацку // 20.I.95 //* [Янка Брыль]» (Янка Брыль «First snow», Масква, 1981; КП14-9965), *«Полоцкому музею // беларуского // книгопечатания // — автор. // Светл. Алексиевич // 14.11.02 г.*» (С. Алексіевіч «Чернобыльская молитва», Масква, 1998; КП17-18713), «*У музей // беларускага кнігадрукаванння. // Ганаруся, што „Вастрыё стралы“ // знайшло сюды дарогу. // 20.03.96. Алесь Разанаў*» (А. Разанаў «Вастрыё стралы», Мінск, 1988; КП15-12933), «*Музею белорусского книгопечатания // — спасибо за эту выставку на // родине нашего первопечатника. // Авторы* [Инесса Плескачевская] // [Михаил Пеньявской] *// 11.01.2019. // Полоцк*» (І. Плескачэўская «Исторические прогулки с Франциском Скориной», Мінск, 2018; КП23-42775). Актуальным сёння будзе пажаданне Сяргея Плыткевіча: «*Музею беларускага // кнігадрукавання // з надзеяй, што турыстычныя // групы будуць стаяць // перад вашым будынкам // вялікі чэргамі, што кожны // беларус будзе лічыць сваім // гонарам — пабываць у Полацку. // (С. Плыткевіч)*» («Ад Полацка пачаўся свет», Мінск, 2006; КП19-24366).

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-24-27

Музей беларускага кнігадрукавання падтрымлівае асабліва цесныя сувязі з палачанамі, якія ўносяць значны ўклад у папаўненне кніжнага фонду НПГКМЗ. Прэзентацыі сваіх кніг, сустрэчы з землякамі ў музеі ў розны час праводзілі Алесь Аркуш, Пятро Васючэнка, Лера Сом, члены літаратурных аб'яднанняў «Надзвінне» і «Полоцкая ветвь» і многія іншыя: «*Музею кнігадрукаваньня // з падзякай за гасьціннасьць. // Алесь Аркуш // 29.04.2015. // Полацк*» (Алесь Аркуш «Песьні ля Замкавай гары», Полацк, 2015; КП22-36349), «*Бібліятэцы // Полацкага музея // кнігадрукавання, // з пажаданнем // плёну і // ўдзячных чытачоў. // Пятро // Васючэнка*» (П. Васючэнка, А. Вырвіч «Прыгоды аднаго губашлёпа», Мінск, 1999; КП16-16911), «*Назаўсёды любімаму // музэю з надзеяй // на тое, што гэта не // апошняя кніжка, // якую я яму // падпісваю!* [Лера Сом]. *21.10.2005*» (Лера Сом «Свабода Слова Зіма», Мінск, 2005; КП19-23247).

*Тэматычны комплекс 5*. Матэрыялы комплексу ілюстравалі супрацоўніцтва Музея беларускага кнігадрукавання з рознымі ўстановамі, выдавецтвамі, арганізацыямі: «*Музею кнігадрукавання // ў Полацку ад // рэдакцыі ARCHE // Д. Жукоўскі // 12.02.05*» («ARCHE», № 1, 2005; КП19-23247), «*Музею // беларускага // кнігадрукавання // с найлепшымі // пажаданнямі плёну // ў працы па пра- // пагандзе беларускага // кнігавыдання і бела- // рускай мовы // выдавецтва „Амалфея“ // 21.12.2002 г.*» («Комментарий к Трудовому кодексу Республики Беларусь», Мінск, 2000; КП23-45489), «*Музею // Беларускага кнігадрукавання // ад выдавецтва „Кніжны Дом“ // з павагай і ўдзячнасцю за // вялікую працу ўвекавечання // самабытнай беларускай // кніжнай культуры. // 8 лютага 2003 г. Дырэктар-выдавец // С. В. Кузьмін*» (С. М. Зайцаў «Медицина для всех», Мінск, 2002; КП18-21790).

Галоўны акцэнт быў зроблены на кнігу «Мама. Маці. Матуля» (Мінск, 2006; КП21-31488) з дароўным надпісам мастака, на той час галоўнага кансультанта Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Валерыя Рагалевіча: «*Музею белорусского // книгопечатания Полоцкого историко- // культурного музея-заповедника — // в коллецию лучших книг // Беларуси, выпуска 2006 года. // На XLVII (47) Национальном конкурсе // „Искусство книги — 2007“ в результате // тайного голосования высшую наг- // раду конкурса — Гран-При с присуж- // дением Большого Золотого Фолианта // и Диплома имени Франциска Скорины // жюри присудило книге „Мама. // Маці. Матуля“ Издательство // „Мастацкая літаратура“. Художники // Алексей Петров и Валерий Рогалевич. // Полиграфическое исполнение — // Белорусский Дом печати. // С дружеским сердцем — // Валерий Рогалевич, художник // издания, консультант Министерства // информации Республики Беларусь. // 20.04.2012 г.*».

Ужо некалькі дзесяцігоддзяў музей падтрымлівае сувязі з Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Штогод у фонды музея перадаюцца кнігі-лаўрэаты конкурсу «Мастацтва кнігі», галоўным арганізатарам якога з'яўляецца Міністэрства інфармацыі. У 2006 г. і сам музей быў узнагароджаны дыпломам «За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны» і знакам-сімвалам «Залаты фаліянт», уручэнне якіх прайшло падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Паставах. Выстаўкі лепшых кніг Беларусі дэманструюцца на Днях беларускага пісьменства ў розных гарадах Беларусі, дзе можна сустрэць аўтара кнігі ці выдаўца і атрымаць аўтограф на памяць.

Плённае супрацоўніцтва звязвае Музей беларускага кнігадрукавання з выдавецтвам «Беларусь», якое неаднаразова выпускала прысвечаныя музею наборы паштовак і падрыхтаваныя музейнымі супрацоўнікамі фотаальбомы. Сярод іх «Кніжныя скарбы Беларусі», што пабачылі свет ў 2017 г. да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

Дапаўняла выставу фотахроніка — *тэматычны комплекс 6*. Яна размяшчалася ў рамах на сцяне і складалася з фотаздымкаў розных гадоў, на якіх былі прадстаўлены асобныя аспекты музейнага жыцця ў храналагічным парадку.

Такім чынам, выстаўка «У самы жывы з усіх музеяў з пажаданнямі...» дала магчымасць наведвальнікам музея не толькі ўбачыць унікальныя выданні з фондаў НПГКМЗ, але і бліжэй пазнаёміцца як з дзейнасцю Музея беларускага кнігадрукавання, так і з асаблівасцямі музейнай работы ў цэлым.

Дароўныя надпісы ў адрас Музея беларускага кнігадрукавання з'яўляюцца арыгінальнай крыніцай вывучэння яго гісторыі, дэманструюць адносіны да яго грамадства, сведчаць пра вядомасць і прэстыж Музея, паказваюць яго значэнне ў культурным жыцці краіны.

 DOI: 10.52928/978-985-531-807-2-2022-24-27

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Бонами, З. А. Музей после музея. XXI век / З. А. Бонами // Как читать и понимать музей. Философия музея / З. А. Бонами. — Москва, 2018.— Гл. 6. — С. 183—223.
2. Шумовіч, А. У. Музей беларускага кнігадрукавання як асяродак збірання, захавання, вывучэння і прапаганды помнікаў кніжнай культуры / А. У. Шумовіч, Г. П. Ладзісава // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 1996 г.) / укл. Т. Джумантаева. — Полацк : Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, 1997. — С. 42—50.

# ИНСКРИПТЫ В КНИЖНОМ СОБРАНИИ НАЦИОНАЛЬНОГО ПОЛОЦКОГО ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО МУЗЕЯ-ЗАПОВЕДНИКА: РЕПРЕЗЕНТАЦИОННЫЙ ПОТЕНЦИАЛ И ВОЗМОЖНОСТИ ЭКСПОНИРОВАНИЯ

*Анучина Наталья Владимировна,*
*старший научный сотрудник Музея белорусского книгопечатания — филиала НПИКМЗ*

*В статье рассматривается вопрос репрезентационного потенциала инскриптов на материале дарственных надписей из книжного собрания Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника, а также возможности использования изданий с автографами в выставочной деятельности Музея белорусского книгопечатания.*

***Ключевые слова**: инскрипты, дарственные надписи, репрезентация, выставка, Музей белорусского книгопечатания.*